*І.Б.ВЫШЫНСКАЯ*

# ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ ЯК ВАЖНЕЙШЫ ФАКТАР САЦЫЯЛІЗАЦЫІ АСОБЫ СТУДЭНТА

Агульнавядома, што адукацыя – важны фактар у працэсе сацыялізацыі асобы. Сёння адной з задач працэсу адукацыі з'яўляецца стварэнне ўмоў для адэкватнай сацыялізацыі асобы ў сучасным грамадстве, што ў канчатковым выніку павінна паслужыць перадумовай для станаўлення культуры асобы навучэнца.

Адзначым, што асоба не з'яўляецца толькі суб'ектам уздзеяння ў адносінах да сістэмы адукацыі як культурнага інстытута. Кожны індывід з прычыны унікальнасці светапогляду, жыццёвага і культурнага вопыту ўносіць свой уклад у культуру яго асяроддзя. У гэтай сувязі з пазіцыі праблемы інстытуальных сацыякультурных узаемадзеянняў інстытут вышэйшай школы можна разглядаць у двух аспектах. З аднаго боку, кожная вышэйшая навучальная ўстанова выступае «вытворцам» асобага роду «тэкстаў» адукацыйнага, нарматыўна-каштоўнаснага характару і арганізацыйй, якая вывучае, збірае і забяспечвае доступ спажыўца да іх. З другога – вышэйшая навучальная ўстанова ажыццяўляе вучэбныя, асветніцкія і выхаваўчыя мерапрыемствы па засваенні студэнтамі ўказаных вышэй «тэкстаў».

З дапамогай пэўных «тэкстаў» ВНУ, як і кожны з культурных інстытутаў, спрабуе рэгуляваць свядомасць і паводзіны людзей у адпаведнасці з каштоўнаснымі ўстаноўкамі грамадства, а таксама распрацоўваць методыкі правільнага і эфектыўнага выкарыстання адпаведных «тэкстаў». Трэба адзначыць, што распрацоўка, укараненне, распаўсюджанне культурных «тэкстаў», каштоўнасцей, нормаў непасрэдна звязана з такімі з'явамі, як культурная палітыка, культурная кампетэнтнасць канкрэтнай асобы.

Адштурхоўваючыся ад культурнай палітыкі дзяржавы, культурныя інстытуты распрацоўваюць і прапануюць параметры іерархіі сацыякультурных каштоўнасных арыенціраў грамадства, сістэму прыярытэтаў яго сацыяльнага быцця, сацыякультурныя нормы ўзаемадзеяння паміж асноўнымі дзяржаўнымі, грамадскімі інстытутамі і асобай. У адпаведнасці з мэтамі агульнай культурнай палітыкі кожны культурны інстытут вызначае свае мэты і метадалогію, на аснове якой будзе адбывацца практычная рэалізацыя гэтых мэт.

Існуе шмат меркаванняў аб задачах адукацыі па трансляцыі агульных і спецыялізаваных ведаў, узнаўленні культуры і яе базавых каштоўнасцей і традыцый. Нельга не пагадзіцца з думкай А.Я.Фліера, што адукацыя перш-наперш узнаўляе існуючы грамадскі парадак, рыхтуючы сацыялізаваных, кампетэнтных і па магчымасці лаяльных удзельнікаў у калектыўным жыцці, якія прытрымліваюцца нормаў, правілаў і законаў, прынятых у дадзенай краіне [2, с.88]. У гэтым кантэксце ў якасці асноўнай задачы адукацыі як найважнейшай ўмовы сацыялізацыі асобы выступае фарміраванне культурнай кампетэнтнасці студэнцкай моладзі.

Паняцце культурнай кампетэнтнасці доволі поўна раскрывае А.Я.Фліер, разумеючы, перш за ўсё, тую ўмоўна дастатковую ступень сацыялізаванасці і інкультурацыі індывіда ў грамадстве, якая дазваляе яму разумець, выкарыстоўваць і варыятыўна інтэрпрэтаваць усю суму штодзённых (неспецыялізаваных) ведаў, а часткова і спецыялізаваных. Адначасова ён заўважае, што гэтыя веды ўвайшлі ў штодзённы побыт, складаюць норму агульнасацыяльнай эрудзіраванасці чалавека ў дадзеным асяроддзі, суму правілаў, прыкладаў, законаў, звычаяў, забарон, этычных установак і іншых рэгулятываў паводзін, сістэму агульнапрынятых сімвалаў, асноў светапогляду, ідэалагічных і каштоўнасных арыентацый, непасрэдных ацэнак, сацыяльных і міфалагічных іерархій і да інш.

Улічваючы вышэйадзначанае, культурную кампетэнтнасць можна разглядаць як важнейшы фактар сацыялізацыі асобы, таму што, чым вышэй узровень культурнай кампетэнтнасці чалавека, тым больш ён запатрабаваны грамад- ствам, тым больш у яго магчымасцей для самавыяўлення, самаразвіцця, самаактуалізацыі і прызнання як індывідуальнасці. У гэтым кантэксце праблема фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый у студэнцкай моладзі з'яўляецца на сённяшні дзень найбольш актуальнай і запатрабаванай. З'яўляючыся паказчыкам культурнай кампетэнтнасці асобы, сістэма каштоўнасных арыентацый выступае адным з галоўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгулятываў паводзін людзей. Але арганізацыйную ролю яна выконвае тады, калі з'яўляецца, па-першае, несупярэчлівай, а па-другое, дастаткова ўсвядомленай. У процілеглым выпадку можа стаць дэстабілізуючым фактарам.

Адным з напрамкаў рашэння азначанай праблемы ў сістэме адукацыі з'яўляецца пабудова адукацыйных стандартаў, дзе прадстаўлены сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны, якія, у сваю чаргу, даюць маральны арыенцір студэнту, устаноўку на пэўную пазіцыю ў сферы ўзаемаадносін з культурай.

*На наш погляд, гуманітарныя, сацыякультурныя веды з'яўляюцца асноўнымі ў фарміраванні асобы студэнта ў вышэйшай школе, яго светапогляду, духоўных каштоўнасцей, культурнай кампетэнтнасці. У адрозненне ад прыродазнаўчых і тэхнічных ведаў, сацыякультурныя веды сканцэнтраваны не столькі на аб'екце, прадмеце і тэхналогіі сацыяльнай практыкі і пазнання, колькі на яе суб'екце.*

Адукацыйныя стандарты з'яўляюцца прамым працягам той культурнай палітыкі, якую ажыццяўляе дзяржава. Зусім відавочна, што змест адукацыі і рысы будуемай культурнай кампетэнтнасці асобы павінны адпавядаць сацыякультурнаму тыпу грамадства і фарміраваць асобу, адэкватную гэтым патрабаванням. Цяжкасць такога працэсу заключаецца ў суадносінах прыярытэтаў культурна-каштоўнасных сістэм, якія дамінуюць у грамадстве і якія запатрабаваны дзяржавай. Так, сёння дзяржава на першы план вылучае сацыяльныя, грамадска-патрыятычныя, нацыянальныя каштоўнасці. У той жа час у грамадстве пераважаюць больш прагматычныя, асобасныя каштоўнасці, якія ставяць на першы план матэрыяльны дабрабыт індывіда. І, як паказваюць шматлікія даследаванні, студэнцкая моладзь у гэтым плане не выключэнне.

Неабходна адзначыць, што ў самым агульным выглядзе каштоўнасныя арыентацыі ўяўляюць складаную, вельмі супярэчлівую сістэму, у якой адбываецца асэнсаванне тых ці іншых з'яў у жыцці чалавека і грамадства, іх сацыяльнай значнасці і суадносін з грамадскімі ідэаламі. Іх змест адлюстроўвае ўяўленне асобы аб аптымальным ладзе таго сацыякультурнага асяроддзя, у якім яна жыве, усяго грамадства ў цэлым аб сэнсе жыцця, жадаемых перспектывах развіцця і інш. Але і асяроддзе, як вышэй адзначалася, уплывае на фарміраванне сістэмы каштоўнасных арыентацый асобы. У кантэксце адукацыі сацыякультурнае асяроддзе навучальнай установы з'яўляецца адным з асноўных фактараў, якія ўплываюць на фарміраванне каштоўнасных арыентацый студэнтаў. Дзейнасць ВНУ сведчыць, што існуе сувязь паміж духоўна-маральнымі каштоўнасцямі і ўстаноўкамі ў навучальным працэсе, у якой непасрэдна інтэгруецца асоба студэнта.

Адсюль можно зрабіць вывад, што для аптымізацыі навучальнага працэсу, яго найбольшай эфектыўнасці сацыякультурны змест каштоўнасных арыентацый студэнтаў павінен знаходзіць адлюстраванне ў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, тэхналогіях, агульных падыходах.

У кантэксце вышэйазначанага гуманізацыя адукацыі, якая адбываецца сёння як каштоўнасная пераарыентацыя чалавечага мыслення і дзейнасці з прадметна-матэрыяльных кампанентаў на суб'ектыўна-гуманістычныя, можа выступаць механізмам фарміравання культурнай кампетэнтнасці студэнта ў час яго навучання ў ВНУ. Адным з цэнтральных напрамкаў у гэтым працэсе з'яўляецца зварот да культуры, фарміраванне праз яе кампаненты гуманістычнага светапогляду асобы. Так, адна з асноўных ідэй новага культурна-адукацыйнага і сацыяльна-педагагічнага мыслення – пераход ад ведацэнтрычнай да культураадпаведнай парадыгмы вышэйшай школы. Пры гэтым сам новы вобраз культуры павінен, па-першае, праектавацца, па-другое, засвойвацца чалавекам рэфлексіўна як яго асобы жыццёвы праект. Такое адно з карэнных адрозненняў традыцыйнага спосабу засваення індывідам культуры ад шукаемага спосабу свядомага авалодвання культурай.

Менавіта таму за канцэптуальную аснову адукацыйных стандартаў была прынята інтэрпрэтацыя гуманітарнай адукацыйнасці, дзе разглядаецца як індывідуальнасць, якая набывае з улікам культурных універсалій упэўненасць у зменлівых жыццёвых умовах. Можна сказаць, што якім чалавек мысленна ўбачыць свет, такім ён і будзе. З дапамогай гуманітарных ведаў студэнт асвойвае жыццё, асаблівасці сваёй прафесіі ў каштоўнасна-сэнсавым плане. Вывучэнне сацыяльна-гуманітарных прадметаў стварае спрыяльныя магчымасці для ўсведамлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

светапоглядных і метадалагічных функцый навукі. Гэта асабліва важна для тэхнічных ВНУ, дзе часцей за ўсё адносіны прырода- знаўчых і тэхнічных навук да духоўнай культуры і светапогляду лічацца нейтральнымі. Такая сітуацыя ўскладняецца і неразуменнем месца гуманітарных дысцыплін з пункту гледжання базы, над якой будуюцца тэхнічныя веды.

У ідэале мэтай адукацыі з'яўляецца фарміраванне асобы, якая здольна весці культурны дыялог ва ўсіх сферах жыццядзейнасці: эканамічнай, палітычнай, светапогляднай і інш. Важна, каб гэты дыялог быў каштоўнасна арыентаваны. А для гэтага асоба павінна быць высокамаральнай, умець прымаць рашэнні і адказваць за іх. Гэта тычыцца не толькі свайго асабістага жыцця, але і соцыуму, і грамадства ў цэлым. Зразумела, такія патрабаванні прад'яўляюцца ідэальнай, адладжанай сістэме адукацыі. Сёння яны вядуць да пошуку аптымальных мадэляў выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, да вызначэння змястоўнага боку кожнай дысцыпліны, да праблем структуравання вывучаемага матэрыялу.

Калі зыходзіць з таго, што гуманітарныя веды заўсёды маюць аксіялагічную накіраванасць, а ўсе навукі сацыяльна-гуманітарнага цыкла так ці інакш адлюстроўваюць агульначалавечыя, нацыянальныя, агульнасацыяльныя і іншыя каштоўнасці, тады для больш дакладнага ўяўлення працэсу фарміравання ў студэнтаў сістэмы каштоўнасных арыентацый можна прапанаваць мадэль класіфікацыі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, азначаных у адукацыйным стандарце, па ступені адлюстравання імі ў сваім змесце тых ці іншых каштоўнасцей (гл. схему). Прапанаваная класіфікацыя мае хутчэй схематычны, умоўны характар і непасрэдна суадносіцца з класіфікацыяй каштоўнасцей па сферы накіраванасці. Аснова мадэлі гэтай класіфікацыі заключаецца ў тым, што з улікам спецыфікі кожная дысцыпліна сацыяльна-гуманітарнага цыкла адлюстроўвае ў сваім змесце ў большай ступені тыя ці іншыя базавыя каштоўнасці ў адпаведных тэорыях, пазіцыях, фактах і інш.




*Схема мадэлі класіфікацыі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін з улікам адлюстравання (перадачы ) у іх змесце базавых каштоўнасцей*

Прапанаваная мадэль не азначае пераважную ўвагу толькі да адпаведных каштоўнасцей пры выкладанні той ці іншай дысцыпліны. Зразумела, што ў рэальным сацыяльным жыцці каштоўнасці ўзаемазвязаны. Сёння прынята гаварыць аб міжпрадметным падыходзе, асабліва ў гуманітарных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведах. Але «без дысцыплінарнага члянення выкладаемых курсаў абысціся нельга, і ў той жа час важна памятаць аб умоўнасці рубрык, бо аб'ект усіх дысцыплін адзін – чалавек у дыялогу з культурай» [1, с.46].

У агульным выглядзе стандарты сацыяльна-гуманітарнай адукацыі павінны ў'яўляць комплексную сістэму выкладання, дзе дысцыпліны дапаўняюць адна адну, дзе асноўная лінія для кожнай з іх – аналіз маральна-светапоглядных рэгулятываў дзейнасці людзей. Пры вывучэнні матэрыялу пэўнага курса могуць быць прапанаваны пытанні і праблемы, якія звязаны з каштоўнасным выбарам чалавека ў якой-небудзь сферы дзейнасці. Студэнт жа на падставе самастойных намаганняў пры дапамозе крытычнага аналізу і параўнання магчымых альтэрнатыў выпрацоўвае асобасныя перакананні, пазіцыі.

Як адзначалася вышэй, у працэсе гуманітарызацыі адукацыі на першы план вылучаецца асоба навучэнца. Навучальны працэс прадугледжвае дыялог паміж выкладчыкам і студэнтам, у ім супастаўляюцца іх пазіцыі. Дзякуючы дыялогу прызнаецца права студэнта на незалежны выбар індывідуальнай пазіцыі.

Такім чынам, гуманітарныя дысцыпліны аказваюць значны ўплыў на фарміраванне каштоўнасных арыентацый асобы студэнта, ствараючы ўмовы для станаўлення яго культурнай кампетэнтнасці і абумоўліваючы паўнаважкі працэс яго сацыялізацыі ў сучасным грамадстве.


1. *Миненков Г.Я.* Образовательные стандарты гуманитарных дисциплин: из опыта разработки // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – №6. – С. 40–48.

2. *Флиер А.Я.* Культурология для культурологов. – М.: Академический проект; Екатеринбург: Деловая книга, 2002.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ